Источник: "Наша слова" - 2014-12-24

# Кніга па беларускай геральдыцы

У лістападзе 2014 года ў кнігарнях г. Менска з'явілася цікавая кніга "Таямнічны свет беларускіх гербаў", якую напісаў гарадзенец Аляксей Шаланда - вядомы беларускі спецыяліст па геральдыцы і сфрагістыцы Вялікага Княства Літоўскага. Ён працуе ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі. У 2000 годзе абараніў дысертацыю па тэме "Шляхецкая геральдыка Беларусі ў другой палове XVI-XVIII ст.", з'яўляецца заснавальнікам і выдаўцом навуковага геральдычнага часопіса "Герольд Litherland".

Ідэйны натхняльнік і каардынатар дзейнасці навуковай ініцыятывы "Цэнтр генеалагічных даследаванняў".

Новая навукова - папулярная кніга вядомага айчыннага даследчыка геральдыкі прысвечана гербам беларускай шляхты ў канцы XIV - XVIII ст. . Упершыню разглядаюцца перадумовы, шляхі фармавання і асаблівасці развіцця шлехецкай геральдыкі ў ВКЛ.

У асобным раздзеле ахарактарызаваны асновы тэарэтычнай геральдыкі з яе законамі і правіламі, уводзіцца ва ўжытак традыцыйная, беларуская геральдычная тэрміналогія. У афармленні вокладкі выкарыстаны выявы гербаў "Корсак", "Масальскі", "Макаровіч" і "Солтан" (Малюнкі з гербоўніка Б. Папроцкага, 1584 г.). Кніга мае наклад 600 асобнікаў. Выдавец - А.М. Янушкевіч.

Кніга разлічана на шырокае кола чытачоў, якія цікавяцца гісторыяй Беларусі, а таксама праблемамі беларускай геральдыкі і сфрагістыкі. Навукова - папулярнае выданне каштуе 153 тысячы рублёў. Ужо адбылася прэзентацыя кнігі ў выдавецтве "Галіяфы"...

***Аляксей Шалахоўскі.***

Аляксей Шалахоўскі. Кніга па беларускай геральдыцы